ТЭЛЕПРАГРАМА НА ТЫДЗЕНЬ

№32 (1845)

Субота, 21 лютага 2004 г.
Выдаецца з ліпеня 1995 г.
на беларускай і рускай мовах
Перыядычнасць —
5 разоў у тыдзень
Выдавец:
УП «Народная воля».

Кошт свабодны.

Народная Воля

E-mail : nv@promedia.by
http://nv.promedia.by

Надвор'е

У Мінску сёння ўдзень чакаецца — -3...-1, уначы — -8...-6; у Брэсце ўдзень — -5...-3, уначы — -8...-6; у Гродне ўдзень — -4...-2, уначы — -8...-6; у Віцебску ўдзень — -2...0, уначы — -5...-3; у Гомелі ўдзень — -7...-5, уначы — -6...-4; у Магілёве ўдзень — -4...-2, уначы — -5...-3. На ўсёй тэрыторыі краіны — без ападкаў.

www.meteo.by

ПУЛЬС

Поспехаў у працы...

Аляксандр КУЦАЛАЙ паедзе Надзвычайным і Паўнамоцным паслом Рэспублікі Беларусь у Сацыялістычнай Рэспубліцы В'етнам. Былы міністр прамысловасці **Анатоль ХАРЛАП** — паслом Беларусі ў Кітаі, **Валянціна АЗАРЭВІЧ** прызначана членам Праўлення Нацыянальнага банка, **Юрый МЕРАНЦАЎ** — намеснікам міністра абароны, **Пётр РАГАЖЭЎСКІ** — першым намеснікам старшыні Дзяржаўнага ваенна-прамысловага камітэта, **Іван ДЫРМАН** — намеснікам міністра абароны па ўзбраенні — начальнікам узбраення Узброеных сіл Рэспублікі Беларусь, **Анатоль КАСАВЕЦ** — начальнікам штаба ўзбраення — першым намеснікам начальніка ўзбраення Узброеных сіл.

Аляксандр ІВАНКОЎ атрымаў згоду ад прэзідэнта Рэспублікі Беларусь на прызначэнне першым намеснікам міністра гандлю, **Віктар БУРЫ** — на прызначэнне намеснікам старшыні Мінскага гарвыканкама, **Андрэй ХУДЫКА** — на прызначэнне старшынёй Лідскага райвыканкама Гродзенскай вобласці, **Аляксандр РАГАЧОЎ** — на прызначэнне рэктарам Гомельскага дзяржаўнага універсітэта імя Ф.Скарыны.

Вінцук Вячорка пра газавую вайну

"Газавая вайна" — толькі пачатак праблем, якія прынесла краіне кіраванне Лукашэнкі", — так пракаментаваў узніклыя праблемы з пастаўкамі расійскага газу ў Беларусь лідэр Партыі БНФ Вінцук Вячорка.

У каментарыі палітыка, распаўсюджанай прэс-службай Партыі БНФ, гаворыцца: "Адказны кіраўнік краіны ніколі б не давёў сітуацыю з энерганосьбітамі да крайнасці. Нашы суседзі — Літва, Эстонія, Польшча, Украіна — не адчуваюць сур'ёзных праблем з газам. Яны не гулялі ў "саюзныя дзяржавы", а будавалі сваю ўласную незалежную дзяржаўнасць. Гэтыя краіны размаўлялі з Расія не як "малодшыя браты", а як дастойныя партнёры. Лукашэнка ж сваёй палітыкай разбурае асновы незалежнай беларускай дзяржаўнасці, закладзеныя на пачатку 90-х гадоў, і робіць нашу краіну зручным аб'ектам для газавага шантажу".

У гэтай сітуацыі, мяркуе Ввячорка, Лукашэнка павінен падаць у адстаўку.

Юрый ПАЦЁМКІН, БелаПАН.

Курсы замежных валют

На 21 лютага Нацыянальны банк Беларусі ўстанавіў наступныя афіцыйныя курсы замежных валют:

1 долар ЗША — 2151,00 рубель
1 еўра — 2721,66
1 расійскі рубель — 75,49
1 аўстралійскі долар — 1689,72
1 балгарскі леў — 1394,67
1 дацкая крона — 365,31
1 СДР — 3227,17
1 ісландская крона — 31,53
10 японскіх іен — 199,40
1 казахскі тэнге — 15,47
1 канадскі долар — 1614,56
1 кувейцкі дынар — 7298,95
1 кыргызскі сом — 49,53
1 латвійскі лат — 4062,32
1 літоўскі літ — 788,22
1 малдаўскі лей — 171,12
1 нарвежская крона — 308,38
1 польскі злоты — 555,35
1 сінгапурскі долар — 1276,56
10.000 турэцкіх лір — 16,19
1 украінская грыўна — 403,18
1 англійскі фунт стэрлінгаў — 4053,45
1 чэшская крона — 83,33
1 шведская крона — 296,31
1 швейцарскі франк — 1726,81
1 эстонская крона — 173,98

БелаПАН.

ТЕМА ДНЯ

Цель «газовой атаки» понятна — захватить Беларусь

"Представьте, зима, двадцатиградусный мороз, а Россия отключает газ. Причина для этого всегда найдется. Ее может стать задолженность за энергоресурсы. И что тогда? Кто-нибудь прикидывал, сколько детей и пожилых может оказаться в больницах? Могут выйти из строя отопительные и водопроводные системы. Сколько времени и средств потребуется, чтобы их восстановить?"



В эти дни есть о чем поговорить белорусскому вице-премьеру Андрею Кобякову (слева) и его российскому коллеге Виктору Христенко.

Фото ByMedia.net

Это фрагмент из статьи в нашей газете, опубликованной года два тому. Из-за подобных публикаций власти недолюбливают "Народную волю". Но прогнозы, высказанные в них, довольно часто сбываются. Пока до замерзания труб в наших квартирах дело не дошло, но где гарантия, что следующей зимой ситуация не повторится? Тем более, что конфликт пока не разрешен, контракт на подачу газа продлен лишь до конца месяца, а Россия показала, на что она способна.

"Газовая атака" началась довольно стремительно и столь же неожиданно захлебнулась. Она продержалась около суток. И здесь встает вопрос: "Если так быстро нашлось решение, то зачем надо было на глазах всей Европы играть мускулами, обмениваться острыми уколами?" А они были острыми как никогда. Александр Лукашенко назвал действия России актом терроризма на самом высоком уровне. Не удержался в строгом дипломатическом русле российский МИД. Обычно склонный к крайне обтекаемым формулировкам, на этот раз он отозвался нетипично резко, почти с мужицкой прямотой: **"Лукашенко берет курс на обострение отношений с Россией...** На президенте Беларуси лежит ответственность за те системные ошибки во внутренней и внешней политике страны, которые тормозят социально-экономическое развитие государства и которые уже привели к изоляции Беларуси на международной арене". "Спровоцировав кризис вокруг поставок российского газа, Лукашенко таким образом пытается отвести от себя критику и переложить ответственность за свои ошибки на Россию", — заявил представитель российского МИДа.

До сих пор Москва избегала столь жестких персональных характеристик Лукашенко.

Это, очевидно, свидетельствует о том, что недовольства сторон накапливались долгое время и вырвались наружу, как гной из перезревшего прыща.

Каковы итоги скоротечной и плохо подготовленной "газовой атаки"? И с какой целью она затевалась? Во-первых, "Газпром" основательно подмочил свою репутацию как надежного поставщика. "Эта ситуация ставит под вопрос надежность российских поставщиков газа, причем не только в Польшу, но и во всю Западную Европу", — заявил в четверг премьер-министр Польши Лешек Миллер. Поляки тут же подписали меморандум о взаимопонимании с норвежской Statoil. "Если раньше норвежский газ казался нам слишком дорогим, то теперь, возможно, мы пересмотрим свое мнение", — говорят польские специалисты. Заволновались и другие потребители. Свое недовольство они адресовали "Газпрому", а не Беларуси, ибо договоры заключали с ним, а не с Минском.

Россияне не столь наивны, чтобы не предвидеть подобную реакцию своих потребителей и не понимать ее вреда. Тем не менее решились на такой шаг. Стало быть, они руководствовались какими-то более важными причинами. Какими? Вот в чем суть вопроса, самого главного.

Ответ на него ищут все серьезные издания. Раздумывая над ним, нельзя не обратить внимание на тот факт, что не так давно Украина основательно откачивала российский газ из трубы, а если говорить прямо, то воровала его. Тем не менее газовый вентиль тогда не перекрывали. Почему перекрыли сейчас? На российском сайте "Страна.RU" высказаны следующие предположения: "Используя тактику острых уколов в самое чувствительное место в нужные моменты, можно будет регулярно напоминать, кто от кого находится в зависимости... Российские аналитики полагают, что Россия нуждается в сохранении этого эффективнейшего способа посадить Лукашенко за стол переговоров. Россияне и белорусы должны будут провести ряд переговоров на высшем уровне, на которых будут подниматься все вопросы в комплексе. В их числе приватизация с участием россиян "Белтрансгаза", затягивание белорусами введения общей валюты и, наконец, объединение двух стран. До тех пор, пока эти вопросы не будут сняты, россияне, скорее всего, будут небольшими гомеопатическими дозами лечить режим Лукашенко, отключая газ".

Поняли, о чем речь? Вначале отдайте России "Белтрансгаз", затем переходите на российский рубль, после чего наступает объединение в одну страну. Александр Лукашенко назвал истинными причинами такого поведения России следующие: и **"отдать газовые трубы Миллеру, электрические сети — Чубайсу, нефтепроводы — российской "Транснефти", железные дороги — ОАО "Российские железные дороги"..."** Причем требуют отдать за бесценок.

Стало быть, ставки России очень высоки и за ценой она не постоит. В такой ситуации неудобствами партнеров, пусть и зарубежных, можно и пренебречь. Что касается белорусского руководства, то его собираются пугать не только газом, но и "экономическими цунами". Такую мысль высказал *заведующий отделом российского Института стран СНГ Александр Фадеев в интервью одному московскому обозревателю. Вот фрагмент из этого интервью:*

"С мой точки зрения, режим Лукашенко уходит. Видимо, так или иначе, но будет смена: с помощью кризиса, иным путем. России уже надо думать о выстраивании перспективных отношений с Беларусью, а не конкретно с нынешним режимом. С моей точки зрения, Лукашенко, если так будет действовать и дальше, может не досидеть и до 2006 года — до президентских выборов. Что бы ни заявляло белорусское правительство о достижениях, экономика страны кризисная, она на деле лишена всяческих ресурсов".

Намек, как говорится, более чем прозрачный. И он бьет в самое больное место. Кстати, это не единственный намек из Москвы. Программа "Вести" российского телевидения, отмечая временный характер соглашения по газу, подчеркивает, "Москве и Минску предстоит нелегкий разговор". Первый заместитель председателя Госдумы Александр Жуков более откровенен: "Надеюсь все-таки на то, что Беларусь пойдет по пути экономической и политической интеграции с Россией. В этом случае мы сможем строить свои экономические отношения уже на других условиях".

Так что, жесткая позиция "Газпрома" по цене, к тому же резко взлетевшей вверх, а затем и отключение газа — это, скорее всего, не из-за долгов, а продиктовано глобальными причинами, названными выше. На первом этапе — овладение контрольным пакетом акций "Белтрансгаза". Ведь "Белтрансгаз" — предприятие не рядовое, а стратегическое. Достаточно посмотреть на европейскую газотранспортную систему и многое станет ясным. Через Беларусь самый короткий путь из России в Европу. Прорабатывается маршрут доставки туркменского газа в Европу, конечно, в обход России, чтобы смягчить монополизм "Газпрома" на этом пространстве. В этом проекте могла бы поучаствовать с пользой для себя и наша страна. Но при условии, что она останется независимой и имея "Белтрансгаз". Российскому "Газпрому" для усиления своего монополизма необходимо во что бы то ни стало овладеть этим нашим предприятием. Так что драка за него — это бой ради будущего.

Сергей ИВАНОВ.

Зянон ПАЗЬНЯК

Захаваем дзяржаву!

Паважаны сябра!

На Беларусі робіцца такая палітыка, што мы можам страціць дзяржаву і незалежнасць. Наша нацыянальная маёмасць, зямля, нетры, прыбытак у працы і ўсё нацыянальнае багацце, уключаючы культуру і адукацыю, могуць апынуцца ў расійскіх руках. Мы не будзем мець нічога свайго, не зможам распараджацца вынікамі сваёй працы, не зможам ствараць сабе законы і планаваць гаспадарку. Усё нашае стане не нашым. Усім нашым стане распараджацца Масква. Чужыя людзі запануюць у нашым доме.

Гэтага дамагаецца Расія і яе мафіёзна-фінансавыя групы...

Грамадзяне Беларусі павінны выразна ўсведамляць, што **пагроза страты незалежнасці — рэальная.** І калі хто мае яшчэ прапагандысцкія ілюзіі, што будзе, як і раней, развіваць свой бізнес ці вытворчасць пры расійскіх законах, канкурыруючы з расійскай мафіяй і рускім алігархічным капіталам, той хай хутчэй развітваецца з такімі ілюзіямі, каб не было позна.

Калі кагосьці ўгаварылі, што ён будзе атрымліваць расійскую пенсію, — забудзьце пра гэта. Увядуць расійскі рубель — не будзе чым плаціць нават заробкі, а праз павышэнне цэнаў на камунальныя паслугі, цяпло, газ забяруць рэшткі пенсіі. (Гэта ўжо адмыслова робіцца.)

Калі хто спадзяецца, што будзе працаваць на заводзе пры чужых гаспадарах — не спадзявайцеся, бо выкінуць на вуліцу. Расійцы не будуць развіваць вытворчасць на Беларусі.

Калі хто, жывучы на сяле, думае, што да яго прыедзе п'яны тамбоўскі калгаснік, каб пакарыстацца "роўным" правам на беларускую зямлю, той памыляецца. Прыедзе расійскі алігарх накшталт Абрамовіча, "прыхватызуе" агулам беларускія землі і будзе нажывацца.

Калі хто думае, што, апынуўшыся пад ваенна-атамнай Расіяй, ягоныя сыны будуць мірна служыць у войску на Беларусі, той памыляецца. Ён забыўся пра СССР і расійскія войны.

Калі беларускі начальнік думае, што, пусціўшы расійскага чыноўніка кіраваць сваім жыццём, ён нязменна застанецца на сваім месцы начальнікам, ён горка пашкадуе, бо ўсё будзе інакш, чым ён думае.

Людзі проста не могуць уявіць той небяспекі, што іх чакае, калі прыйдзе Расія. Ім здаецца, што ўсё гэта так — разважанні.

Што трэба, каб абараніць сябе і незалежнасць Беларусі?

Напачатку трэба зразумець: сёння толькі **ад нас, беларусаў, залежыць** — захаваем мы сваю дзяржаву, абаронім свой нацыянальны інтарэс ад расійскага крыміналу, альбо Беларусь будзе здадзена пад Маскву, і нас выкарыстаюць у тупіковым працэсе аднаўлення Расійскай імперыі.





Яшчэ паўгода таму мітынгоўшчыкі нават і блізка не маглі падысці да расійскай амбасады (памятаеце, колькі было разгонаў!), а цяпер людзей прама з заводаў і фабрык накіроўваюць да сцен пасольства суседняй краіны.

Фота ByMedia.net

Галаву ў чужы хамут?

Уключаю раніцай 19 лютага Беларускае радыё, чую пра начное адключэнне расійскага газу і дзіву даюся выказванням: "имперская политика России", "грубый шантаж", "неуважение к белорусскому народу", "акт терроризма"... Няўжо, няўжо — падумалася — нарэшце ўлады вырашылі агучыць даўнія і сённяшнія (заўсёды паслядоўныя, бо адпавядаюць праўдзе жыцця) выказванні Зянона Пазьняка і яго аднадумцаў? Яны ж столькі год даводзяць, пераконваюць — праз неабвержныя факты: халуйства, угодніцтва, рабскія паводзіны перад усходняй суседкай да дабра не давядуць.

Беларускія ўлады абураліся і пераследавалі тых, хто лічыць: трэба будаваць добрасуседскія, а ніякія не "саюзныя" стасункі з сучаснай Расіяй. Будаваць на ўзаемавыгаднай, разліковай, рынкавай аснове, а не на хціўых пацалунках і біцці крамлёўскага посуду ў прыліве эйфарыі ад міфічна-фантастычных перспектыў зліцця дзвюх дзяржаў у адну. Таму неабходна ўзняць на шчыт і ўвасабляць у жыццё нацыянальную ідэю, лепш за якую цывілізаванае чалавецтва нічога не прыдумала. Будаваць свой Беларускі дом — суверэнную, незалежную, дэмакратычную краіну, грамадзяне якой стануць гаспадарамі на сваёй зямлі, збудуюць годнае жыццё для сябе і нашчадкаў, увасобяць спрадвечную мару многіх пакаленняў. А з усім светам, у тым ліку і з суседзямі, трэба ладзіць добрыя адносіны, сябраваць, гандляваць, супрацоўнічаць.

Згубіць сваю незалежнасць — згубіць усё: ніхто тады не будзе цябе паважаць, лічыцца з табой, улічваць твае патрэбы. І вось пацвярджэнне: мы яшчэ не сталіся (юрыдычна) расійскай губерняй, а адносіны да Беларусі з яе боку ўжо, як да халопа. Ранейшыя дамовы нічога не значаць, іх можна мяняць і адмяняць з мэтай палітычнага і эканамічнага ціску на Беларусь. А што ж далей, калі, не дай Бог, саюзная дзяржава стане фактам? Пра якое раўнапраўе, павагу, спрыяльныя ўмовы для беларусаў можна будзе тады казаць?

І ўсё ж, як ні парадаксальна, я не віню ў такіх "піруэтах" толькі Расію: яна трымаецца свайго інтарэсу, што і павінна рабіць любая дзяржава (праўда, цывілізаванымі сродкамі). Галоўная віна — на кіраўніцтве Беларусі. Чаму у нас не мысляць перспектыўна, самі соваюць галаву ў чужы хамут?

Ну каму не вядома — і гэта сусветная практыка — што нельга прывязваць сваю эканоміку, дзяржаву да адной крыніцы атрымання рэсурсаў? У гэтай "крыніцы" заўсёды будзе спакуса скарыстаць такое "адналюбства" выключна на ўласную карысць. Колькі пра гэта гаворана-перагаворана... І вось мы чуем усяленскі кіраўнічы лямант: каравул, якая несвядомая Расія — нам капейкі за ваенныя аб'екты плаціць, а нас за газ бязлітасна душыць! Ужо і мітынгі пратэсту з чырвона-зялёнымі сцягамі і праклёнам нядаўняму "старшему брату" Пуціну ля сцен пасольства Расійскай Федэрацыі ў Мінску бушуюць (дарэчы, яшчэ ў нядаўнія часы за набліжэнне да гэтага пасольства з лозунгамі супраць імперскай палітыкі кіраўніцтва Расіі колькі "пратэстантаў" прайшлі праз суды і нары на Акрэсціна?).

Што крычаць, лямантаваць без толку? Сваю палітыку трэба мець, сваю галаву на плячах. А калі, прабачце, ужо нічога не атрымліваецца, то трэба саступіць кіруючае месца больш разумным, дальнабачным і патрыятычным грамадзянам.

Калі глядзець у корань, то відавочна: апошняя "газавая атака", што ледзь не абярнулася бядой для ўсіх жыхароў нашай краіны, — хутчэй не апошняя. І выток падобных "гульняў" — у шкодных для Беларусі інтэграцыйных гульнях, якімі без одуму, у спадзяванні на нерэальныя амбіцыйныя праекты захапіліся вярхоўныя начальнікі нашай краіны. Ім з гэтай багны краіну і выцягваць.

Віктар ЧАРНЯХОВІЧ, жыхар г.Барысава.

Народная Воля
21 ЛЮТАГА 2004 г.

БЕЛОРУСЫ МЕЖДУ НЕБОМ И ЗЕМЛЕЙ

Хроники Анатолия Козловича



Сегодня вместе со мной вы побываете в соседней Украине, чтобы оттуда пристальнее взглянуть на самих себя в Беларуси. Поскольку хроники автобиографические, отправной точкой путешествия станет моя малая родина, а вы, читатель, отправляйтесь от своей. Так, через малые родины, мы лучше поймем друг друга.

10. Чучело

В августе 2003 года мы с женой и сыном проводили традиционную отпускную неделю в деревне Горск Березовского района, где меня всегда ждет осиротевшая после ухода родителей хата. Въезжаем на усадьбу, под яблони, выгружаем из машины нехитрый скарб. Протираем окна, полы, вворачиваем электрическую пробку, включаем холодильник — через часок хата оживает.

В середине дня на нашу усадьбу зашла молодая, странно, не по сезону тепло одетая женщина, поздоровалась по-украински, не стесняясь попросила одежды и обуви. Я с сожалением сказал, что ничего нет. Побирушка требовательно спросила: "А сало?" Сала мы с собой из Минска не привезли, кабанчика за пару дней в Горске не вырастили.

"То, можэ, хоть картопля е?" — услышал настойчивый вопрос, в котором зазвучала ирония. "Нэма", — сказал я правду. У нас имелось с десяток бульбинок от горской тетки Оли, а гостье из соседней страны требовалось не менее коша. Я видел, что она не поверила, что живу без картошки. Мне стало неловко. Действительно, что это за белорус без бульбы в хате? Пьяница, лентяй!

Чтобы как-то сгладить вину, я спросил женщину, откуда она. "Самарська", — лаконично ответила побирушка и ушла, обиженная.

Ну, естественно, она из украинской деревни Самары, что в Ратновском районе, пограничном с Кобринским районом Беларуси. Откуда же ей быть! До деревни Самары от Горска напрямик, через леса и болота, будет километров пятьдесят, по окружной дороге, через Кобрин и Дивин, — все восемьдесят.

Самары! Это слово в Горске настолько известно, что стало нарицательным. Мама рассказывала, что при Польше о человеке, с жадностью набросившемся на еду, в Горске говорили: "Голодны, як з той Самары". Об односельчанине, без видимых причин запустившем хозяйство и дом, у нас говорили: "Жывэ, як у Самары".

В пятидесятых-шестидесятых годах, как подтверждает моя детская память, побирушки из Самары нередко появлялись в Горске. Нашу деревню они облюбовали, наверно, потому, что она стояла на шоссе, была легкодоступной. Кроме того, почти столетие Горск с его единственным в регионе зарегистрированным молитвенным домом был баптистской столицей Березовского, Кобринского, Дрогичинского, Пружанского районов. Многолюдная верующая деревня была предрасположенная к милосердию, о чем и полетела международная молва.

Самаряне, как видим, приходят к горчакам за подаянием по сей день. За столетие сменилось столько властей, однако в деревне Самары общественно-социальная атмосфера остается без изменений. Уникальная деревня!

***

Феномен деревни-побирушки до того разжег мое любопытство, что в середине девяностых, зимой, я решил туда съездить. Дорога обозначена на карте: Горск—Кобрин—Дивин—Самары.

На неохраняемой границе с Украиной сносное белорусское шоссе, ведущее к югу от городка Дивин, как обрезало. Украинская дорога изобиловала колдобинами, ямами, лужами, глубокой колеей. Летом проехать на легковом автомобиле было бы непросто.

Справа и слева от дороги лежала заснеженная пустошь осушенных болот. Судя по их виду, заброшенных. Если бы они активно использовались в севообороте, то не поросли бы молодыми деревцами, а неочищенные каналы не заполнил бы до краев высокий камыш. Бессмысленность "мелиорации" роднит Украину и Беларусь.

Среди испоганенных болот, на возвышенностях, чернели хутора. На один из них, отъехав от государственной границы три километра, я завернул по мерзлой целине — и очутился в другой цивилизации. Хутор был неогороженный, голый, неуютный, не обсаженный со всех сторон высокими деревьями, как в Брестской либо Гродненской областях. Не было солидного сада, обязательного для белорусского хутора. Пара яблонь, покосившихся от ветра, и неухоженные заросли вишни — это несерьезно для настоящего хутора.

Посередине маленького огорода стояло раздетое чучело, видно было, что на ветру оно околело. Мне невыносимо захотелось внести его в сарай. А где же у них растет картошка? Гектар хуторской земли, не меньше, должен быть под картошкой. Тесный хутор, как этот, — нелепица на земле. Как я ни вертел головой, картофельного поля не обнаружил, со всех сторон хутор подпирало неухоженное болото.

Хутор состоял из хатки, крытой рубероидом, и длинного, низкого сарая, крыша которого представляла растерзанный ком гнилой соломы, кое-как прижатой кривыми палками различной толщины и длины. В моем Горске уже полвека солома не используется как кровельный материал. А когда использовалась, примерно до пятидесятых годов, то соломка плотно связывалась в венички, три веника соединялись в плоский куль, а тот крепился к жердям (латам). Крыша получалась ровненькой, без помех скатывала воду, меньше гнила.

Хата и сарай украинцев располагались рядом, образуя общий двор, беспорядочно, словно временно, заваленный бревнами, колотыми дровами, кучами навоза, дырявыми корытами, ржавыми ведрами и кастрюлями... По двору, как по свалке, бродили куры, две равнодушные собаки, а также мужчина и женщина. Он и она маленького роста, моложавые, лет по тридцать пять.

На мужчине плотно сидела замызганная фуфайка, валенки с галошами доходили до колен. Шапка-ушанка была мала ему, натянута на голову с усилием, отчего сидела на макушке, опущенные уши ее карикатурно растопырились. Как увидел эту шапку, так и подумал про хозяина: не мог он купить шапку не по размеру, у кого-то выпросил.

Живописно выглядела и женщина миловидной внешности, черноволосая, под цветастой шалью, словно цыганка. На ней было сто одежек, и все — с дырками, с висящими лоскутами. К тому же одежды ее не имели пуговиц, не застегивались, многослойно топорщились, делали женщину круглой, как капуста.

Чтобы оправдать свое вторжение в их хуторскую жизнь, я спросил, далеко ли до деревни Самары. "Тута! Наш куток — самарськи", — доброжелательно откликнулась женщина.

Чтобы удовлетворить свое любопытство, я сначала дипломатично сообщил, что живу в Беларуси, и только затем спросил, бывают ли они у нас. Мужчина ничего не ответил, только настороженно смотрел на меня. Женщина сказала, что "у Білорусі" она бывает, видела, что белорусы живут богато, что власть у нас хорошая, а на Украине плохая, про их хутор забыла. Про мужа добавила, что сидит дома, смотрит за хозяйством и детьми.

Я давно заметил, что незамерзшие окошки хаты облеплены любопытными детскими мордашками, их было так много, что не сосчитать. Бросились в глаза их приплюснутые к стеклу носы и расстегнутые рубашонки. Слава Богу, подумал я, в хате тепло.

Я поспешил распрощаться с хозяевами, устыдившись дальнейших расспросов. Тяжелая, нищенская жизнь хутора просматривалась как на ладони. Меня захлестнула жалость к обитателям наспех слепленного "кутка", административно-географического угла, забытого между болотами, веками, государствами.

Бросив чучелу-сироте пожелание "держись до лета!", я уехал. Точнее сказать, сбежал от своей профессии, чтобы не задавать людям бестактных вопросов.

***

В полукилометре от хутора, за сосновым леском, находилось ядро здешней хуторской галактики — деревня Самары. Большая деревня, напоминающая белорусские местечки с оформленным центром, с главной улицей, универмагом, продмагом, аптекой, конторами сельсовета, колхоза.

На улице Самары я повстречал много людей трудоспособного возраста, что необычно для деревни в середине рабочего дня. Женщины стояли нахлобученной кучей возле магазина. Все одеты на манер знакомой хуторянки — многослойно, как капуста, однако без рванья. В столовой, куда я заглянул из любопытства, мужчины пили вино, шумно гомонили.

Никто никуда не спешил, кроме меня, чужака из другого племени. Украинцы привычно обитали в родном самарском углу, о нем, подозреваю, они готовы под рюмку спеть, как я, белорус, пою о своем, горском: "Мой родны кут, як ты мне мілы!.."

Уникальность человека заключается, кроме прочего, и в том, что он способен полюбить жизненный угол, вынуждающий нищенствовать. Зверь свой угол, который перестал кормить, покидает. Человеком же управляют местные традиции, социальная инерция.

В деревне Самары и окрест я не заметил природно-климатических препятствий для налаживания хотя бы такой жизни, скромной, но добротной, какая существует за пятьдесят километров, в такой же полесской деревне Горск, куда самаряне уже сто лет наведываются за подаянием.

Самарянка, летом 2003 года ушедшая от меня ни с чем, была, видимо, удивлена, а может, и разозлена. В ее представлении, которое у самарян передается от поколения к поколению, у горчаков текут молочные реки в кисельных берегах. Традиция нищеты у самарян переросла в философию нищеты. Согласно этой философии, они уже не просят, а требуют у горчаков одежду, сало и картошку.

Миф о том, что "білоруси" живут богато, — составная часть самарского мировоззрения. Я не буду его разрушать. Как мы живем, мы знаем сами. Не смею учить уму-разуму и самарян, их жизнь есть их выбор, да и вряд ли долетит до них мое эссе. Хотя, повторю, замерзающего чучела жалко. Хороший хозяин чучело на зиму спрячет, а плохой — оставит в огороде. Впрочем, оба варианта взаимоотношений человека и чучела можно встретить и в Беларуси.

Феномен украинской деревни Самары — универсален, носит международный характер. Феноменальна власть местной народной психологии, следование которой для человека может стать важнее собственного достоинства. Повинуясь многолетнему опыту, самаряне, как я убедился, не стыдятся идти и просить.

Инертность группового (углового) сознания настолько сильна, что превратилась для мужчин и женщин в спасательный круг в бурном жизненном потоке. Сто лет деревня Самары побирается, но не исчезла, не обезлюдела, я воочию видел там демографический взрыв. Такой взрыв для вымирающих соседок — Украины, России, Беларуси — положительное явление.

Инфантильные побирушки Самары своей приспособляемостью к жизни вселяют в меня уважение к человеку с той же настойчивостью, что и рациональные, предусмотрительные горчаки-земляки.

***

В восьмидесятых годах в Горск пришел природный газ. Путь его был нелегкий, сквозь капризы больших и маленьких начальников, через непреодолимый долгострой. В прокладке трубы я участвовал журналистским словом, о чем горские мужчины вспоминают в подпитии, обещая поставить мне памятник. Газ — это освобождение от тяжелого труда по заготовке дров. Поднес горящую спичку — через полчаса дом теплый.

В хате сделались лишними громоздкая русская печь и отопительная печка (грубка). Лет пять после газификации они стояли на исконных позициях: печь — в кухне, печка — в чистой комнате. Люди не верили, что газ пришел в хату навсегда. Накопление дров не прекратилось, ими заполнялись сараи, пристройки, навесы. Людьми управляла массовая психологическая установка на то, что начальники, как всегда, обманут, и газ в трубе иссякнет. А коль так, зачем ломать печь и печку, пусть стоят, кушать не просят.

Природный газ в хате — явление не только прикладное, но и эстетическое. В кухне, где ежедневно утром и вечером не горит печь, становится чище. Сверкает белизной газовая плита, а рядом — громадина-печь с закопченным зевом. Ну, красиво ли? Некрасиво. Значит, печь надо ломать? А как жить без печи? Где удаются самые наваристые щи и самые румяные пироги, кроме печи? Где можно прогреть тело и душу, если не будет печи?

Перестройка в Горске по времени и сущности примерно совпала с горбачевской: в Горске перестраивали кухни, не ликвидируя русской печи, в СССР перестраивали общество, не ликвидируя компартии. Что вышло в итоге?

Печальную судьбу СССР вы знаете. Судьбу печи можно считать благополучной. Чтобы в газифицированной кухне было белым-бело, закопченную печь перенесли в специальные пристройки к хате или в отдельно стоящие будки. Там печь и продолжает свое служение: готовит щи, печет пироги, сушит грибы, варит картошку и тыкву для скота...

Во время перестройки в Горске родилось новое выражение: вынести печь. Можно было сказать про печь, что ее сломали, разобрали, выбросили. Нет, ее именно вынесли! Как будто бережно взяли на руки, подняли, осторожно вынесли в пристройку, поставили на новое место. Чувствуете, сколько уважения и любви народа в словосочетании — вынесли печь!

Психологическая установка диктует лексикон. Думаю, ни одна из горских печей не обиделась на людей. Дрова есть, огонь гудит, дымоход тянет, а больше работящая печь ни о чем не мечтает.

***

Иная судьба у печек-грубок. Этих не вынесли ни одной. Они остались там, где их поставили, когда строили дома. Поскольку печки не топятся, их используют как часть интерьера. Красиво выкрашенные, они служат перегородками, основанием для картин и календарей, на них вешают часы, занавески, рушники.

Словно нарядные невесты, печки в горских хатах символизируют ожидание. Невесты, конечно, надеются на лучшее, а печки ждут пакости. Печкам передалась традиционная уверенность народа в том, что от властей хорошее не исходит, а если исходит, то временно, значит, газ они обязательно перекроют. И этим горчаков не испугают, потому что печки в любой миг готовы к работе, а дров в запасе на много лет.

В Горске холодные, но красивые печки стоят в домах два десятилетия. В деревне Хидры Кобринского района, куда газ пришел раньше, печки ждут государственного подвоха свыше тридцати лет! И ведь могут дождаться. В любой момент в ответ на какую-либо глупость белорусских управленцев Россия вздумает приостановить "голубой поток". Или газ настолько подорожает, что сделается для бедной деревни неподъемным.

И что тогда? Тогда горчаков и хидруков обогреет только их гениальное недоверие к власти. Над их хатами в ясный зимний день встанут вечные дымы. В их дверь постучатся побирушки-самаряне, по местной украинской традиции ожидающие от своей власти чуда, а от горчаков — картошки, будто она тут валится с неба.

***

Мама мне рассказывала, со слезами, как голодала. Это было в тридцатых, когда мой дед уехал в Аргентину на заработки, оставив в Горске жену с четырьмя детьми. За океаном больших денег он не нашел, семье не помогал, и она голодала. С двенадцати лет моя мама ходила вместе со своей матерью на заработки к зажиточным односельчанам.

Летом девочке доверяли жать серпом надрозорник. Розора — это заглубленная борозда между загонами, напоминающая канавку. Там ходили, как по тропинке, туда стекала с поля лишняя вода. Рожь над розорой росла ниже, реже, узенькую полоску называли надрозорник (по-полесски — надрозуорнык) и поручали жать неумелым девочкам-подросткам или слабым старухам. "Жну-жну, — рассказывала мама, — и думаю только про обед: ну когда хозяйка позовет жней есть кашу? Я свою кашу съем, как будто я из Самары, а мама свою оставляет до вечера. А она ж — голодная..."

Вечером остатки холодной каши, похожей на блин, хозяйка разрезала на куски, отдавала жнеям. Моя бабушка, ее звали Ганной, была она баптисткой, несла кашу-блин домой, трем голодным сыновьям.

Чтобы не побираться, Ганна отправила малолеток на заработки в соседние деревни — пасти коров у богатых хозяев. А перед тем всю ночь молилась, в слезах просила у Бога, чтобы простил ее. За что? Наверно, за то, что на Него надеялась, а сама не плошала, выкручивалась, как вьюн, тянула, как вол, упиралась, как лошадь. И не переставала молиться: каждое воскресенье — в Горском молитвенном доме, каждый вечер — перед сном.

***

Бабушка Ганна, мы с братом звали ее "бабка-любка", на коленях молилась в своем углу, а в другом углу Беларуси, в деревне Поречье Лидского района, подрастала девочка Тома. Однажды ее с одноклассниками повезли на экскурсию в Брестскую крепость.

Когда автобус въехал на территорию Брестской области, девочка заколотилась от страха. Она боялась, что сейчас автобус остановят, выволокут учеников и учительницу на обочину шоссе, где только что промелькнула табличка "Горск", и начнут мучить. Кто? Баптисты! Мучители-баптисты живут в Брестской области, о них девочке говорили в школе...

Пройдет время, она станет моей женой и полюбит Горск и горчаков так же, как я. Сейчас, после недоразумения летом 2003-го, когда вновь собираемся на родину, я прошу Тамару Николаевну не забыть ненужную одежду, вдруг к нам во двор зайдут самаряне...

ПУЛЬС

Усе на суботнік?

У аграрным сектары Брэстчыны пагаршаецца сітуацыя з палівам. Яго няхватка перад пасяўной стала ўжо традыцыйнай. Дзе ж выйсце? Аблвыканкам, як паведамляе praca-by.info, вырашыў так: аб'явіць 21 лютага днём падтрымкі сельскагаспадарчых прадпрыемстваў. Усе заробленыя ў гэты дзень сродкі пойдуць на фінансаванне вясенне-палявых работ, у прыватнасці, на набыццё гаруча-змазачных матэрыялаў. Удзел у такім "суботніку" павінны прыняць усе працоўныя калектывы, незалежна ад форм уласнасці.

Андрэй ВАСІЛЬЧУК.

Вадзіцель-ліхач атрымае па заслугах

Неабгрунтавана мяккім прызнала судовая калегія па крымінальных справах Мінскага гарадскога суда прыгавор суда Кастрычніцкага раёна сталіцы ў дачыненні да жыхара Мінска А.Жоўніча. Ён быў асуджаны да 3,5 года пазбаўлення волі з адхіленнем ад права кіравання транспартнымі сродкамі тэрмінам на 5 гадоў.

Як паведамілі ў прэс-цэнтры рэспубліканскай пракуратуры, А.Жоўніч, рухаючыся на аўтамабілі "Альфа-Рамеа" па сталічнай вуліцы Маскоўскай з хуткасцю 144 кіламетры ў гадзіну, урэзаўся ў аўтамабіль "Форд-Сіера". У выніку чаго адзін чалавек загінуў, а яшчэ двое атрымалі цяжкія раненні. Улічваючы, што раней Жоўніч 8 разоў, у асноўным за перавышэнне хуткасці, прыцягваўся да адміністрацыйнай адказнасці, нанесены ўрон не кампенсаваў, пракуратура Кастрычніцкага раёна ў касацыйным парадку абскардзіла першапачатковы прыгавор у гарсудзе. У выніку цяпер мера пакарання яму будзе перагледжана.

Андрэй АЛЕКСАНДРОВІЧ.

Здарэнні на чыгуначных пераездах

17 лютага ў 22 гадзіны 10 хвілін на трэцім кіламетры чыгуначнага перагону Бароўцы — Баранавічы-Цэнтральныя вадзіцель легкавога аўтамабіля збіў пуцявы слупок. Машына выехала на чыгуначны пераезд і заглохла. Вадзіцель машыны, асоба якога зараз вызначаецца, уцёк з месца здарэння і пакінуў там машыну. Паводле паведамленняў чыгуначнікаў, толькі пільнасць пуцейцаў і работнікаў міліцыі, якія прынялі меры для эвакуацыі аўтамабіля з чыгуначных рэек, не прывяла да трагедыі, наступствы якой маглі быць непрадказальнымі.

Яшчэ адно здарэнне адбылося 18 лютага ў 11 гадзін 48 хвілін на 518-м кіламетры чыгуначнага перагону Баравое — Зябкі (участак Круляўшчызна — Полацк). Пасажырскі дызель-цягнік наехаў на аўтамабіль маркі "мерседэс", які выехаў на пераезд, нягледзячы на гукавую сігналізацыю. Як паведамляе аддзел інфармацыі БЧ, вадзіцель і пасажыры аўтамабіля, убачыўшы прыбліжэнне цягніка, выскачылі з машыны, што і выратавала ім жыццё. Экстраннае тармажэнне, прымененае машыністам, не дапамагло. Чыгуначнікі здзіўленыя тым, што ў гэтым выпадку пацярпеў не аўтамабіль, а дызель-цягнік, у выніку чаго рух паяздоў на гэтым участку быў спынены на некалькі гадзін.

Аляксей АРЭШКА.

СІТУАЦЫЯ

Ідуць гадзіннікі... на склад

Растуць запасы нерэалізаванай прадукцыі на складах Віцебскага прыборабудаўнічага завода, які спецыялізуецца на вытворчасці гадзіннікаў і запасных частак да іх. Гэты працэс заканамерна суправаджаецца спадам "валу", за што кіраўніцтва прадпрыемства вымушана слухаць ушчуванні гарадскога і абласнога начальства.

Але, на думку дырэкцыі і спецыялістаў, у спадзе вытворчасці ёсць шэраг аб'ектыўных прычын. Па-першае, на фінішы мінулага года Віцебскіх прыборабудаўнікоў раптоўна падвялі партнёры: ад віцебскай прадукцыі адмовіліся спажыўцы з Афрыкі і Мінскі гадзіннікавы завод, які дагэтуль браў значную долю запчастак.

Не менш сур'ёзнай прычынай крызісу лічаць на прадпрыемстве рэзкае павышэнне кошту сыравіны, матэрыялаў і энергарэсурсаў. Каляровыя металы падаражэлі на 30%, а газ — на 22%, што немінуча пацягнула за сабой і павышэнне рознічных цэн.

У такіх умовах нарошчваць вытворчасць і цяжка, і немэтазгодна, бо чым даражэй гадзіннікі, тым менш на іх попыт. Гандлёвыя арганізацыі далёкага замежжа не цікавяцца беларускімі гадзіннікамі, бо могуць атрымаць лепшыя з больш тэхнічна развітых краін, а расійскі рынак завалены аналагічнымі вырабамі з Кітая — не менш прывабнымі, але больш таннымі.

Адзінае, на што цяпер спадзяюцца і робяць стаўку віцебскія прыборабудаўнікі, — мэблевая фурнітура, на якую пакуль што ёсць попыт.

Сяргей БУТКЕВІЧ.

ЗАПРАШАЛЬНЫ БІЛЕТ

Ідзіце на Людмілу Шамчук

Сёння, 21 лютага, у Нацыянальным акадэмічным Вялікім тэатры оперы і балета адбудзецца опера "Аіда" Вердзі, вядучую партыю ў якой выканае сусветна вядомая спявачка Людміла Шамчук.

Яна некалі працавала ў Вялікім тэатры оперы і балета Беларусі (адразу пасля заканчэння Адэскай кансерваторыі). Выканаўшы вядучыя партыі не толькі ў "Аідзе", але і ў "Лаэнгрыне" Вагнера, "Барысе Гадунове" Мусаргскага, "Пікавай даме" Чайкоўскага, "Князі Ігары" Барадзіна, у 1977 годзе была запрошана ў Вялікі тэатр СССР. У 1989 годзе стала салісткай Венскай оперы. Аб'ездзіла з гастролямі ўвесь свет: выступала ў Еўропе, ЗША, Лацінскай Амерыцы, Японіі. Аднак пры ўсіх неверагодных паваротах кар'еры Людміла Шамчук ніколі не забывала тэатр, у якім упершыню выйшла на сцэну. І свой цяперашні прыезд у Мінск яна прысвячае памяці рэжысёра Сямёна Штэйна і дырыжора Яраслава Вашчака, якіх лічыць сваімі настаўнікамі.

Юлія ЦЯЛЬЦЕЎСКАЯ.

ПРЕЗЕНТАЦИЯ

Заинтригованные Радзивиллы

Эпоха интриг и авантюр в истории Беларуси — это период между двумя самыми, пожалуй, драматичными событиями позднего средневековья: нашествием шведов и не менее кровавой Северной войной. Каких только бед не изведала Речь Посполитая в это время! Бедствия сыпались на державу одно за другим: война с турками, внутренние бунты, казачьи и крестьянские бунты, солдатские конфедерации, шляхетские рокоши, домовые войны магнатов, отречение короля от престола и даже двукоролевье, когда одновременно правили два короля, причем каждый из них считал другого узурпатором.

Именно этот период описан в очередной книге белорусских писателей **Ирины Масленицыной** и **Николая Богодзяжа "Радзивиллы — в эпоху интриг и авантюр".** Она вторая из задуманного этими авторами и руководством издательства "Триоль" цикла книг о несвижской линии могучего магнатского рода Радзивиллов. Как и предыдущая, книга написана языком, доступным даже для человека, далекого от исторической науки. Материал подается в форме серии исторических миниатюр, каждая из которых, без сомнения, будет интересна не только историкам, но и широкому кругу читателей. Причем все события не выдуманы авторами, не "высосаны из пальца", а "раскопаны" ими в архивных хранилищах, древних хрониках и трудах белорусских, русских, украинских, польских, литовских и прочих исследователей истории.

Первая книга этой же серии — "Радзивиллы — несвижские короли" — изданная издательством "Триоль" в 1997 году, уже стала библиографической редкостью.

Наталья ГАК.

ЧУЛІ?

У Мінску высадзіўся ... нямецкі дэсант

Больш за 170 грамадзян Федэратыўнай Рэспублікі Германія прызямліліся днямі ў Нацыянальным аэрапорце "Мінск". Падобны масавы візіт немцаў у нашу краінуназіраецца бадай што ўпершыню за апошнія некалькі дзесяцігоддзяў (з часоў, мусіць, Другой сусветнай вайны). Але на гэты раз "нямецкі дэсант" у беларускую сталіцу даставілі зусім не лётчыкі гітлераўскай "Люфтвафэ", а пілоты спецыяльна зафрахтаванага самалёта Ту-154 айчыннай авіякампаніі "Белавіа".

І мэты візіту грамадзян Германіі, сярод якіх большасць складаюць людзі сталага веку, вельмі і вельмі міралюбівыя — абмеркаваць з беларускімі калегамі па няўрадавых арганізацыях сітуацыю з "трэцім сектарам" у Рэспубліцы Беларусь. Назва буйной беларуска-нямецкай канферэнцыі, якую фінансуе федэральны ўрад Германіі і якая праходзіць гэтымі днямі ў Міжнародным адукацыйным цэнтры на пр. Праўды ў Мінску, — "Грамадзянскія ініцыятывы і партнёрская праца ў агульным доме Еўропа".

Сярод візіцёраў і ўдзельнікаў дыскусій з Германіі — Клаус Воленвэбер, епіскап евангелісцкай царквы Берліна-Брандэнбурга-Сілезскай Верхняй Лаузіц Херберт Шноор, былы намеснік міністра ФРГ, міністр унутраных спраў зямлі Паўночны Рэйн-Вестфалія Рэне Роспель і Йорг Таус, дэпутат германскага Бундэстага, а таксама прадстаўнікі федэральнага Міністэрства замежных спраў, пасол ФРГ у Беларусі Гельмут Фрык і іншыя.

Беларускі бок прадстаўляюць Генадзь Грушавы, старшыня беларускага дабрачыннага фонду "Дзецям Чарнобыля", пісьменніца Святлана Алексіевіч, якая зараз пражывае ў Германіі, Марыя Худая, намеснік старшыні камісіі па праблемах чарнобыльскай катастрофы, экалогіі і прыродакарыстання ППНС, Яўген Шыракаў, старшыня беларускага аддзялення Міжнароднай акадэміі экалогіі, усяго — 240 удзельнікаў з Беларусі.

З прывітальным словам да больш чым 400 удзельнікаў беларуска-германскай канферэнцыі звярнуліся мітрапаліт Мінскі і Слуцкі Філарэт, які паведаміў, што *"праваслаўная царква благаслаўляе кожную грамадзянскую ініцыятыву"*, а таксама міністр замежных спраў Беларусі Сяргей Мартынаў, які, акрамя шматлікіх слоў удзячнасці за *"актыўную дапамогу нямецкіх няўрадавых арганізацый ахвярам чарнобыльскай катастрофы"*, узгадаў і газавую тэму. Сяргей Мартынаў ледзь-ледзь не давёў нямецкіх пенсіянераў да расчуленых слёз, паведаміўшы, што афіцыйны Мінск згадзіўся на ўмовы Масквы, на якія не пагаджаўся раней, якія тычацца коштаў за газ, *"у тым ліку, каб дапамагчы сваім братам, не саромеюся гэтых слоў, па заходні бок ад нашых межаў"* (Германія, як вядома, частку газу з Расіі атрымлівае па беларускай трубе. — **А.С.**).

Як паведаміў "Народнай волі" супрацоўнік Мінскага міжнароднага адукацыйнага цэнтра **Ігар КАПУСЦІН**, *"падобныя канферэнцыі праводзяцца кожны год на працягу апошніх пятнаццаці гадоў". "Адметнасць гэтай канферэнцыі — у тым, што яна праходзіць у Беларусі,* — паведамляе І. Капусцін, — *іншыя чатырнаццаць прайшлі ў Германіі. І ўжо сам факт правядзення беларуска-германскага форуму, прысвечанага сумеснай працы ініцыятыўных груп, сведчыць пра тое, што прадукцыйнае супрацоўніцтва паміж грамадзянскімі суполкамі нашых краін магчыма толькі пры актыўнай падтрымцы шырокіх слаёў насельніцтва — нягледзячы на тое, што афіцыйныя зносіны паміж краінамі Еўрапейскага Саюза і Рэспублікай Беларусь фактычна зведзены на нішто".*

Галоўным сюрпрызам для нямецкага дэсанта ў Мінску ўсё ж такі сталі зусім не неабходнасць ляцець на састарэлым, амаль архаічным Ту-154, якія амаль ужо не з'яўляюцца па экалагічных прычынах у нямецкіх аэрапортах, і нават не замілаваныя словы міністра Мартынава, а надзвычай моцны мароз, які спусціўся ў чацвер і пятніцу на Беларусь: з залы пасяджэнняў да аўтобуса, які мусіў даставіць немцаў у гатэль, яны выляталі куляй.

Візіт дэлегацыі з ФРГ у Беларусь працягнецца да серады, 25 лютага.

Алесь СІЛІЧ.

ЛІСТ З ЗАМЕЖЖА

Знак нязгоды

Напярэдадні Каляд і Новага года беларуская дыяспара ў Латвіі атрымала "падарунак" ад урада Беларусі. Узрос кошт віз для наведвання этнічнай радзімы. І гэта без уліку таго, што ў многіх з нас у Беларусі жывуць бацькі, узрост і стан здароўя якіх патрабуюць частых наведванняў. Часта іх дзеці, якія жывуць у Латвіі, з'яўляюцца іх адзіным апірышчам.

Не аднойчы беларусы Латвіі звярталіся з просьбай зменшыць кошт медыцынскіх страховак хоць бы дзецям, якія едуць на канікулы да сваіх бабуль і дзядуль. Аднак... Сёння, каб аднаму дзіцяці правесці лета ў Беларусі, толькі за медстрахоўку патрэбна заплаціць 45 долараў! Несумненна, што з падаражаннем віз нашы бацькі радзей змогуць бачыць і сваіх унукаў, і сваіх сыноў і дачок.

Афіцыйны Мінск тлумачыць, што гэта была мера ў адказ на падняцце кошту віз латвійскімі ўладамі. Аднак атрымоўваецца парадокс: за тое, што больш грошай павінны заплаціць пажылыя беларусы, якія едуць у Латвію да сваіх дзяцей і ўнукаў на вяселле і хрэсьбіны, павінны раскашэліцца і іх дзеці і ўнукі, што едуць да іх у Беларусь узараць агарод, нарыхтаваць сена і дроў...

Ёсць у нас прэтэнзіі і да Урада Латвіі. Замест таго, каб у адказ на наша хадайніцтва хутчэй вырашаць пытанне ўзаемазаліку працоўнага стажу, заробленага за межамі Латвіі (у тым ліку і ў Беларусі), латвійскія чыноўнікі ў гэтым годзе на 20 працэнтаў павялічылі кошт віз для грамадзян Беларусі, суседняй краіны, з якой тавараабмен з кожным годам узрастае...

Станіслаў ВАЛОДЗЬКА,
сябар рады
Аб'яднання беларусаў свету
"Бацькаўшчына" і Саюза
беларускіх пісьменнікаў.

КАНФЛІКТ

Рабочыя абаранілі дырэктара

Калектыў Віцебскага камбіната шаўковых тканін са здзіўленнем і абурэннем успрыняў намер кіраўніцтва канцэрна "Беллегпрам" вызваліць ад пасады дырэктара камбіната Андрэя Стрэльскага. Прэзідэнту канцэрна Эдуарду Нарышкіну не засталася нічога іншага, як склікаць сход працоўнага калектыву тэкстыльшчыкаў, якія да таго ж з'яўляюцца акцыянерамі свайго прадпрыемства.

На сходзе, што адбыўся днямі на КШТ, акрамя самога Э.Нарышкіна, прысутнічалі першы намеснік старшыні Віцебскага аблвыканкама Уладзімір Навацкі, былі таксама і кіруючыя асобы гарадской і раённай "вертыкалі".

Працаўнікі прадпрыемства дружна заявілі аб сваёй нязгодзе з датэрміновым скасаваннем кантракту з Андрэем Стрэльскім, які, паводле меркавання тэкстыльшчыкаў, не дарэмна займаў дырэктарскае крэсла. На думку некаторых шаўкавікоў, замена Стрэльскага іншым чалавекам стане прэлюдыяй да пагаршэння сітуацыі на камбінаце.

Паводле тлумачэнняў "звярху", якія прагучалі на сходзе, намер звольніць дырэктара быў прадыктаваны канфліктам адміністрацыі КШТ з кіраўнікамі назіральнага савета акцыянераў і лідэрам прафсаюзнага камітэта. Не жадаючы займацца аналізам процістаяння і прымірэннем варожых бакоў, сталічнае і мясцовае начальства не прыдумала нічога лепшага, чым вырашыць пытанне ў сталінскім стылі: "Няма чалавека — няма праблемы".

Праўда, у праціўнікаў такой радыкальнай меры ёсць і яшчэ адна версія прычын замены дырэктара: маўляў, следам за гэтай заменай можна чакаць продажу камбіната якой-небудзь расійскай фірме, як гэта адбылося з "Белвестам", дзе адразу ж пасля таго, як той жа Эдуард Нарышкін звольніў шматгадовага дырэктара Ларысу Кузняцову, у яе крэсла сеў расійскі бізнесмен, а славутае абутковае прадпрыемства перайшло ў маёмасць гандлёвай фірме з Расіі. На сходзе прагучалі розныя меркаванні, але большасць аратараў заклікала да падтрымкі Андрэя Стрэльскага.

Слесар Міхаіл Ісакаў, ткачыхі Людміла Іларыёнава, Наталля Шарапава ды іншыя заявілі, што калектыў КШТ апынуўся ў становішчы заложніка пры барацьбе за "партфелі".

Удзельнікі бурнага сходу дабіліся свайго: Э.Нарышкін паабяцаў пакінуць Андрэя Стрэльскага на дырэктарскай пасадзе. Праўда, з умовай: адміністрацыя камбіната павінна прадставіць у канцэрн новы бізнес-план, які б гарантаваў прырост вытворчасці.

Сяргей БУТКЕВІЧ.

Віцебск.

ЧУЛІ?

Над стварэннем надмагільнага помніка Мулявіну будзе працаваць Аляксандр Каструкоў

Пераможцам адкрытага конкурсу на стварэнне надмагільнага помніка народнаму артысту СССР, мастацкаму кіраўніку ансамбля "Песняры" Уладзіміру Мулявіну стаў скульптар **Аляксандр КАСТРУКОЎ.**

Як паведаміў БелаПАН галоўны спецыяліст упраўлення мастацтваў Міністэрства культуры Мікалай Скварцоў, праект А.Каструкова быў выбраны "з улікам пажадання родных музыканта, найперш яго жонкі Святланы Пенкінай".

Нагадаем, што першапачаткова сярод пераможцаў былі названы скульптары Сяргей Вісізаў і Юрый Палякоў, чые працы былі адабраны з 28 прадстаўленых праектаў. Але канчаткова для далейшага праектавання адабраны эскізны праект А.Каструкова.

Юлія ЦЯЛЬЦЕЎСКАЯ.

ПРЭЗЕНТАЦЫЯ

Віктар Лагоўскі запрашае...

У Беларусі яго імя яшчэ мала вядома, але ж за мяжой ён ужо мае пэўную вагу. Ён экспанаваўся ў краінах Еўропы і Блізкага Усходу. Два гады таму атрымаў падзяку з боку Рускай Праваслаўнай місіі за рэстаўрацыю сэкафрэскі храма Іліі-прарока ў Хайфе (Ізраіль). У тым жа 2002 годзе яго карціна "Похищение надежды" атрымала дыплом Першага міжнароднага фестывалю "Майн Штэтле" ў Ізраілі.

Талент В.Лагоўскага адзначаны і беларускімі мастакамі — нездарма ж з 1998 года ён з'яўляецца членам Беларускага саюза мастакоў.

У бліжэйшы час "Народная воля" пазнаёміць сваіх чытачоў з Віктарам Лагоўскім і раскажа пра яго жыццё і творчы шлях. А пакуль паведамляем: учора, 20 лютага, у галерэі "Мастацтва", што знаходзіцца на праспекце Ф.Скарыны ў Мінску, адбылося адкрыццё выставы маладога (яму 30 гадоў) таленавітага беларускага мастака Віктара Лагоўскага пад назвай "По родным просторам".

Наталля ГУСЕВА.

ВЕРСИИ

Рыбкину дали СП-117?

Олег КАЛУГИН, бывший генерал КГБ

Логическое объяснение тому, что произошло с Иваном Рыбкиным (кандидатом в Президенты России.— **Ред.**), заключается в следующем. В отношении него применили препарат СП-117 (СП — специальный препарат), который в исключительно важных случаях использовался в первом и втором главках КГБ с конца 1980-х годов.

Препарат состоит из двух компонентов — "дот" и "антидот".

